МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
30 жніўня 2017 г.
№32 (416)

ДОБРАЯ НАВІНА

## Праектам зацікавіліся

### Індыйская фармацэўтычная кампанія мае намер супрацоўнічаць з Беларуссю

**У найбліжэйшыя гады ў нашай краіне павінна з'явіцца сумеснае індыйска-беларускае прадпрыемства па вытворчасці лекаў. Падчас сустрэчы з прадстаўнікамі фармацэўтычных кампаній абодвух бакоў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ заслухаў, у якім кірунку развіваецца супрацоўніцтва.**

— Мы актыўна займаемся развіццём нашага прадпрыемства «Акадэмфарм», і можна сказаць, што ўжо створаны дастаткова магутны фармацэўтычны кластар, — запэўніў **галоўны інжынер рэспубліканскага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Акадэмфарм» Міхаіл ГАЎРЫЛАЎ.** — Наш калега і прадстаўнік індыйскага боку доктар Лаліт прыехаў з добрай навіной: індыйская кампанія дала згоду на сумеснае супрацоўніцтва. Ужо з'явілася вельмі цікавая прапанова па стварэнні шэрагу новых прэпаратаў. Таму гэты кірунак супрацоўніцтва падаецца надзвычай важным, асабліва калі вытворчасць удасца наладзіць.

**Дырэктар кампаніі «Чакані-Фарма» доктар Лаліт ЧАКАНІ** у сваю чаргу пацвердзіў, што індыйскія фармацэўты зацікаўленыя сумесным праектам і ў будучыні гатовыя прапанаваць да вытворчасці новыя, яшчэ больш дзейсныя прэпараты.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** yurgel@zviazda.by

ТЭМА ДНЯ

# АДХОДАМ ДАДУЦЬ ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

### А ў краіне з'явіцца дэпазітная сістэма абыходжання з імі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Батарэйкі, папера, упакоўка, пілавінне, масла, шыны... Аб'ём адходаў, якія стварае чалавецтва, велізарны. Толькі летась у Беларусі было сабрана 599 з паловай тысяч кубаметраў другаснай сыравіны са смецця. А ўзровень перапрацоўкі зараз складае 16%. Мала гэта ці шмат?**

стар. 4

КРУГЛЫ СТОЛ

# ПАТРАБУЮЦЦА ЎНІВЕРСАЛЫ

### У Бабруйску шукалі «рэцэпт» паспяховай дзейнасці рэгіянальных СМІ



**Што неабходна рабіць, каб адпавядаць запытам чытацкай аўдыторыі, чаго не хапае для папулярнасці мясцовым друкаваным сродкам інфармацыі, што з сябе павінна ўяўляць сучасная рэдакцыя, ці магчыма раённую прэсу зрабіць самаакупнай... Міністэрства інфармацыі разам з Выдавецкім домам «Звязда» прапанавалі абмеркаваць праблемы рэгіянальных СМІ і выпрацаваць найбольш эфектыўныя шляхі іх вырашэння. У Бабруйску за круглым сталом сабраліся тыя, хто стварае і фарміруе ў краіне інфармацыйную прастору: намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар — галоўны рэдактар «Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ, прадстаўнікі масмедыя краіны, кіраўніцтва Бабруйскага гарвыканкама. Удзел у размове прыняла і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Валянціна РАЖАНЕЦ.
Перад тым як пачаць абмеркаванне, удзельнікі наведалі рэдакцыю газеты «Бабруйскае жыццё», якая сёння спалучае ў сабе друкаваную версію, сайт, радыё, сацыяльныя сеткі, вось-вось запрацуе тэлебачанне. Выданне за кароткі тэрмін цалкам выйшла з ліку стратных. Гэты вопыт стаў адным з наглядных прыкладаў таго, у якім кірунку трэба развівацца.
«МС» прапануе азнаёміцца з найбольш цікавымі думкамі ўдзельнікаў круглага стала.**

стар. 3